# *Элемент нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці “Музычна-інструментальная традыцыя (Смаргонскія найрышы)”*

Музычна-інструментальная традыцыя, якая захоўваецца на тэрыторыі Смаргонскага раѐна, з’яўляецца адметнай праявай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў вобласці “выканальніцкія мастацтвы”, прадугледжанай пунктам 2b артыкула 2 Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Музычна-інструментальная традыцыя Смаргонскага раѐна – ўзор рэпрэзентацыі музычна-інструментальнай выканальніцкай сістэмы фальклору Гродзенскага Панямоння з тыповымі стылістычна-жанравымі (траіста музыка як выканальніцкі стыль, абрадавасць і танцавальнасць як функцыянальнасць музыкі) і марфалагічнымі (саліруючыя (скрыпка), гарманізуючыя (гармонік, акардыѐн ці дуда), рытмізуючыя (бубен з калатушкай ці барабан) інструменты) характарыстыкамі. Народная музыка гісторыка-этнаграфічнага рэгіѐна фарміравалася ва ўзаемадзеянні з культурнымі плынямі суседніх рэгіѐнаў і пад уплывам гістарычных падзей ХХ ст. Элемент складаецца з комплекса ўменняў і навыкаў ансамблевага выканальніцтва ў складзе капэлы традыцыйнай траістай музыкі (падбор музычнай партыі па слыху, дакладнае пачуццѐ рытму, свабоднае валоданне інструментам і музычнай імправізацыяй і інш.), музычна характэрнага мясцовага рэпертуару танцавальнай і абрадавай (вясельнай) музыкі, практыкі музычна-інструментальнага выканальніцтва ў мясцовай супольнасці.

Лакальнай асаблівасцю элемента з’яўляецца шырокавядомая ў рэгіѐне і дакладна зафіксаваная даследчыкамі характэрная партытура мясцовай музычнаінструментальнай капэлі, якая была папулярнай у першай палове ХХ ст. На Смаргоншчыне яна складалася з: саліруючай, вядучай мелодыю скрыпкі, часам – узмоцненай кларнетам, акампануючага мелодыю гармоніка ці акардыѐна, рытмізуючага музычную фактуру барабана. Адметным прадстаўніком мясцовых музыкаў быў Уладзіслаў Іванавіч Буцько (1919-2016 гг.), унікальны музыка-самавук, які большую частку свайго жыцця граў са сваѐй музычнай капэлай танцы і вяселлі па ўсѐй акрузе.







***Уладзіслаў Іванавіч Буцько***

У 1990-я гады яго выканальніцкае майстэрства «з рукі на руку» пераняў мультыінструменталіст Часлаў Альфонсавіч Жых, які зладзіў сямейную музычную капэлу і арганізаваў калектыў “Гулянок” з вучняў школы мастацтваў. Сёння традыцыйнае музычна-інструментальнае выканальніцтва на падставе руплівa сабраных на Смаргоншчыне мелодый практыкуюць розныя музыкі і калектывы.




***Часлаў Жых***

Смаргонскія найгрышы ўключаюць цыкл вясельных маршаў, разнастайныя полькі, вальсы, мелодыі розных танцаў і некаторых песень. Элемент адносіцца да «мастацтва стабілізаваных капэль з налажаным міжпакаленным перайманнем». Для такіх капэляў характэрны: стабілізаванасць (сістэматычнае перыядычнае выканальніцтва на мясцовых вяселлях і танцавальных вячорках); абрадавасць (музыка на вяселлях) і танцавальнасць (музыка на танцавальных вячорках); міжпакаленнае перайманне (праяўленае ў сямейным гурце Ч.Жыха, а таксама змешаных (даросла-падлеткава-дзіцячых) калектывах Смаргонскага раѐна.

Для музычнага рэпертуару інструментальнай традыцыі Смаргонскага раѐна характэрны песенны склад мелодыі найгрышаў, паўторнасць і квартавыя хады ў невялікім дыяпазоне гучання мелодыі. Характэрнымі асаблівасцямі Смаргонскіх найгрышаў з’яўляюцца і падкрэсленае акцэнтаванне моцнай долі, яе секвентнае развіццѐ, немудрагелісты і просты рытмічны малюнак, выкарыстанне пераменнасці ладу (у асноўным з мінору ў мажор). Памеры тыповыя цотныя, з устойлівым завяршэннем музычнай фразы. Тыповай асаблівасцю ў характарыстыцы смаргонскіх найгрышаў з’яўляецца іх разнастайнасць у тэмпавых малюнках: ад спакойнапавольных да яскрава хуткіх, што дае ўражанне бясконцага кругазвароту мелодыі, калі запеў і прыпеў паўтараюцца шмат разоў, ствараючы адчуванне бясконцасці руху па крузе.

***“Смаргонскія найгрышы”***- гэта народная музыка, пад якую танцавалі нашы дзяды і прадзеды, музыка, якая з 1990-х гадоў стала незапатрабаванай з-за разбуральных наступстваў урбанізацыі, а сѐння, дзякуючы руплівай працы яе носьбітаў, адраджаецца і атрымлівае новае дыханне. “Смаргонскія найгрышы” – гэта не толькі першы аб’ект нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Смаргонскага раѐна, але і наогул, першы выпадак уключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь народнай інструментальнай музыкі.









Прапанову па ўключэнні элемента рыхтаваў з 2018 года раѐнны Цэнтр культуры пры дапамозе спецыялістаў дзіцячай школы мастацтваў імя М.К. Агінскага, Жодзішкоўскіх ясляў-сада – СШ.

Архіўныя фотаздымкі і ўспаміны прадаставілі гісторыка-краязнаўчы музей і рэдакцыя газеты “Светлы шлях.




















HOHNER













Папулярныя і вядомыя найгрышы Смаргонскага раёна: Марш “Вясельны” https://youtu.be/wrYSBpvUvRE , вальс “Вішанька” https://youtu.be/BFScO4Rq_wA, полька “Шабасоўка”, танцы “Ліцвін” https://youtu.be/h1xtqdTeuqM і “Нарэчанька” https://youtu.be/YGisHYgpU0M. Гэтыя простыя і такія родныя мелодыі ведае амаль кожны жыхар Смаргоншчыны.

Хто выконвае “Смаргонскія найгрышы” у наш час?

Узор выдатнай культурнай каштоўнасці на высокім узроўні прэзентуецца праз творчасць ***ўзорнага ансамбля народнай музыкі “Гулянок”*** (школа мастацтваў імя М. К. Агінскага);








Фестываль
народнай інструментальнай
музыкі


СКАРБЫ
Рэгіянальны фестываль традыцыйнай

- ***ўзорнага фальклорнага гурта “Нальшчаначка”*** (Жодзішкаўская СШ).









БРЕСТСКАЯ


Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі
16-17
КРАСАВІКА
НАШЧАДКІ
"НАЛЬШЧАНАЧКА"
узорны фальклорны гурт


СИМВОЛЫ - НАША ГОРДОСТЬ
Символы - это память поколений.
Они должны в себя вобрать все самое лучшее, что было у народа в его истории.
© А.Г. Лукашенко

***- калектыў народнай інструментальнай музыкі “Кушлянская капэла”***







На сённяшні дзень распрацавана і зацверджана праграма захавання элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны “Смаргонскія найгрышы” на пяць год, якая ўключае меры для захавання, развіцця і папулярызацыі элемента. Смаргонцы могуць ганарыцца тым, што іх музыку будуць ведаць ва ўсёй Беларусі. Гэта частка нашай гісторыі і культуры, наша каштоўнасць, наша спадчына, якая дасталася нам ад продкаў. Яе захаванне дэманструе існаванне нацыянальнай асаблівасці нашай супольнасці, яе жывую душу.





***Першы фестываль інструментальнай народнай музыкі***

***“Іграю, як знаю, скачу, як хачу”2022 год***

Дзякуючы таму, што элемент выканальніцкага мастацтва «Смаргонскія найгрышы» атрымаў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, 18 чэрвеня 2022 года на базе музея-сядзібы Ф.Багушэвіча ў Кушлянах ўпершыню быў арганізаваны фестываль інструментальнай народнай музыкі! Удзел у ім прынялі пяць калектываў: гурт “Анягож” з Мінска, узорны ансамбль народнай музыкі “Гулянок” і народны нсамбль народнай музыкі “Явар” са Смаргоні, узорны фальклорны калектыў “Нальшчаначка” з Жодзішак і гурт “Кушлянская капэла”.

Мэтамі і задачамі Фестывалю:

-захаванне, развіццё і папулярызацыя традыцыйнай музычнаінструментальнай культуры, якая сёння аднаўляецца ў Смаргонскім раёне;

- дэманстрацыя лепшых ўзораў народнага інструментальнага выканальніцтва носьбітамі і пераемнікамі музычнай спадчыны;

- захаванне і трансляцыя аўтэнтычнага народнага мастацтва, папулярызацыя лепшых узораў традыцыйнай культры з улікам фактару лакальнай спецыфікі і самабытнасці;

- выяўленне і падтрымка музычна адораных людзей, развіццё іх творчага патэнцыялу.

Фестываль садзейнічаў вяртанню жывой прыгожай атмасферы свята, прыгожай камунікацыі з музычнымі і з танцавальнымі сродкамі, і тым самым – аднаўленню не толькі музыкі, але і пэўнай культуры беларускага традыцыйнага адпачынку!



***Другі фестываль інструментальнай народнай музыкі***

***“Іграю, як знаю, скачу, як хачу”2024 год.***






***Трэці фестываль інструментальнай народнай музыкі***

***“Іграю, як знаю, скачу, як хачу”2026 год.***








Калектыў народнай інструментальнай музыкі “Кушлянская капэла”, які дзейнічае на базе ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”, засвоіў і выкарыстоўвае найгрышы: “Смаргонскі вальс, “Сядзела на сасне”, “Кракавяк”, “Акуліна”, “Вясельны вальс”, “Падэспань”, “Полька”, “Факстрот”, “Лысы”.

Засвоены найгрышы “Крэўскі мазурэк” і “Вясельны марш” (А.А. Высоцкі), таксама калектыў вядзе актыўную працу над засваеннем найгрышаў “Кушлянскай капэлы” з архіва Уладзіміра Бярберава.

З мэтай гучання найгрышаў у натуральным для іх асяродзі і адначасова папулярызацыі элемента калектыў прыняў ўдзел у: абласным фестывалі традыцыйнай культуры “Скарбы Гродзеншчыны”; фестывалі – кірмашы “Кераміка Крэва”; абласным фестывалі рэгіянальнага фальклору “Панямоння жыватворныя крыніцы”; абласным фестывалі-свяце “Танцуем па-даўнейшаму” (2023 г.).



У 2026 г. у аг. Жодзішкі адбылася летняя школа традыцыйных танцаў. Пад смаргонскія найгрышы ад гурта “Кушлянская капэла” прайшлі майстар-классы па побытавых танцах.